*Л.Г. Бараноўская (Магілёў)*

# ПАЗНАННЕ ЦЭЛЬНАСЦІ АСОБЫ ПРАЗ ТРАНСФАРМАЦЫЮ АНІМАЛІСТЫЧНЫХ ВОБРАЗАЎ

У літаратуры прырода выконвае мастацка-эстэтычную ролю. Можна пазнаць яе вобразы праз светабачанне чалавека або можна паспрабаваць глыбей угледзецца ў прыродныя таямніцы, спрабуючы зразумець саміх сябе. Надзвычай значную функцыю выконвае вобраз ваўка ў рамане Германа Гесэ "Стэпавы воўк". Трэба адзначыць своеасаблівую мазаічнасць структуры твора, яго складаную ідэйна-жанравую трансфармацыю – перад намі шматслойны філасофскі раман (філасофія Ніцшэ, творчасць Гётэ, светапогляд Дастаеўскага, даследаванні Фрэйда, Юнга, хрысціянства, філасофска-рэлігійныя сістэмы Усходу і інш.).

Вобраз ваўка ў рамане пададзены па-мастацку разнапланава. Зрэшты упершыню гэты вобраз з'явіўся ў Гесэ ў апавяданні "Воўк" (1928), а таксама сустракаем яго ў публіцыстыцы, дзённікавых запісах пісьменніка. Даследчыкі творчай спадчыны Гесэ (Р.Карарашвілі, Е.Лявонава і інш.) разглядаюць гэты вобраз у трох ракурсах: міфалагічным, філасофскім і псіхалагічным.

Воўк – цікавы зааморфны элемент, які прысутнічае ў розных міфалагічных традыцыях. Сярод народаў Еўразіі і Паўночнай Амерыкі вядомы татэмічныя міфы, дзе продак, ад якога пачыналася племя, выступае ў выглядзе ваўка або здольны ў яго пераўтварацца. У хрысціянскай сімволіцы сярэднявечча воўк атаясамліваўся з чортам. Гэты вобраз таксама цесна звязаны з тэмай вайны: воўк – бог вайны (індаеўрапейская міфалогія ўвогуле); ваўкі суправаджаюць бога вайны ў якасці "псоў" (германская, грузінская міфалогіі); ваўкі – самі воіны, члены дружыны (іранская, грэцкая, германская міфалогіі). На Каўказе нават існавала традыцыя прыносіць у ахвяру богу вайны сабак, ваўкоў, а таксама людзей, стаўшых ваўкамі. Паводле агульна-індаеўрапейскага ўяўлення, чалавек, які зрабіў цяжкае злачынства, становіцца ваўком.

Уяўленне аб пераўтварэнні чалавека ў ваўка (ізгоя) і драпежніка (забойцы) яднае многія міфы, а таксама так называемы комплекс "чалавека-ваўка", які вывучаўся З.Фрэйдам і яго паслядоўнікамі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У псіхалагічным плане ў асобе Гары існуюць два пачаткі: ад чалавека і ад жывёлы, дух і інстынкт, свядомасць і падсвядомасць, або, па-Юнгу, "сацыяльная скура" і "самасць": "*Ітак, у Стэпавага воўка існавала дзве прыроды, чалавечая і воўчая... Хаця наш Стэпавы воўк адчуваў сябе то ваўком, то чалавекам, як усе, у кім змешаны два пачаткі, асаблівасць яго заключалася ў тым, што калі ён быў ваўком, чалавек у ім заўсёды займаў пазіцыю вычакальніка і суддзі,- а ў тыя часы, калі ён быў чалавекам, так рабіў і воўк*"[1]. У творы асноўную лінію складае матыў ваўкалака. Паводле І.А.Чароты, вобраз "чалавека-ваўка" мае псіхалагічную абгрунтоўку. Бо існуе нават хвароба, лікантропія, калі "чалавек адчувае сябе ваўком, адпаведна сябе паводзіць"[2].

Што датычыцца філасофскага асэнсавання вобраза ваўка, то тут ён з'яўляецца не менш чым ніцшэанскім сімвалам "дыферынцыраванага адзінца", які супрацьстаіць натоўпу. У пэўных выпадках Ніцшэ называе яго "зверам", а калі і "геніем". Тут зліліся і супрацьпаставіліся адзін аднаму свет хаоса і моц розуму, духоўныя гульні і матэрыяльная рэчаіснасць, ізгой і безаблічнасць наваколля, душа Стэпавага ваўка і буржуазны свет.

Менавіта, як гэтаму свету, свету людзей, супрацьпастаўляе асобу Звышчалавека ў сваёй філасофскай працы "Так гаварыў Заратустра" Ніцшэ, так Гесэ супрацьпастаўляе грамадству Стэпавага ваўка. Даследчыца Е.А.Лявонава слушна гаворыць аб аналогіі паміж поглядамі Ніцшэ і героем Гесэ: "Абодва ўсведамляюць сваё месіянства, далучаюць да бессмяротных сваю геніяльнасць, абодвум уласціва пакутлівая хваравітасць, як душэўна-маральная, так і фізічная; перад усім яна і ўтварае паміж Ніцшэ і героем Гесэ інтымнае, у пэўным сэнсе, падабенства"[3].

Урэшце, прыгадваючы Ніцшэ, трэба адзначыць, што па-рознаму выкарыстоўваліся яго ідэі іншымі палітыкамі, філосафамі. Ідэя Звышчалавека, цяга да волі – гэтымі матывамі, на думку многіх даследчыкаў, карысталіся ў сваёй палітыцы Гітлер, Мусаліні. Таму многія прыпісваюць фашызму ідэі Ніцшэ. Заратустра (а сучаснікі бачылі яго ў асобе Гітлера) – той Звышчалавек, якога чакала чалавецтва дзеля ўтварэння новай сусветнай дзяржавы.

Са зграяй ваўкоў параўновае В.Быкаў людзей, якія былі апанаваны ідэямі фашызму, у сваёй аповесці "Воўчая зграя". І такое параўнанне, здаецца, невыпадковае, бо яшчэ ў індаеўрапейскай міфалагічнай традыцыі зграя ваўкоў выступае сімвалам адзінай дружыны воінаў. Гэты вобраз і ў мастацкім творы звязаны з панаццямі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

барацьбы, вайны, пошукамі ахвяры. У "Воўчай зграі" сусракаюцца два вобразы ваўка: як рэальнай істоты (з-за яго Ляўчук страчвае свайго сябра Грыбаеда) і як сімвала звярынай сутнасці фашызму (з-за яго галоўны герой страціў родных, блізкіх, сяброў). У быкаўскім творы воўк хацеў знішчыць чалавека з прычыны фізіялагічнай (пачуццё голаду), аднак у той жа час жаданне драпежніка знайсці, знясіліць і знішчыць ахвяру асацыіруецца з прагай чалавеказабойства і філасофіяй чалавеканенавісніцтва, якія ўвасабляюць гітлераўцы.

Блізкароднасныя ідэі яднаюць фашызм і сталінізм. У прыватнасці, абедзве ідэалогіі многае бяруць ад Ніцшэ. Нездарма зараз параўноваюць гэтыя дзве з'явы. У сваім артыкуле "Магістрал" С.Дубавец, абмяркоўваючы тэму падзей 30-х гг., у звязку з распаўсюджанай у творчасці Быкава тэмай вайны, піша: "...Адсутнасць вайны надзіва незаўважная. Таксама і аўтарава вернасць сабе не выклікае сумневу. Інакш кажучы, вайна і фашызм тут цалкам саступілі месца давайне і сталіншчыне, і падмена не цвеліць вока"[4]. Далей ён абгрунтоўвае факт ідэнтычнасці фашызму і сталінізму, цытуючы словы самаго Быкава пра раман В.Гросмана "Жыццё і лёс": «Менавіта з гэтага рамана мы зведалі падабенства страшэнных рэчаў што да дзіўнага падабенства дзвюх, як здавалася, цалкам процілеглых сістэм улады ў найбуйнейшых дзяржавах Еўропы. Высвятляецца, імперскі рух у Германіі намінальна з'яўляўся таксама і сацыялістычным, ставіў на мэце збудаванне гарманічнае народнае дзяржавы, што, праўда, на расавым грунце; гітлераўская партыя афіцыйна насіла назву "нямецкая нацыянал-сацыялістычная рабочая партыя"; фактычнай асновай улады і тут і там быў адкрыта выяўлены аўтакратызм; абедзвюм дзяржавам, хоць, можа, і ў рознай ступені, былі ўласцівы такія з'явы, як культурны нігілізм, улада ўсемагутнае тайнае паліцыі, разгалінаваная, беспрацэдэнтная ў гісторыі зямной цывілізацыі сістэма канцлагераў, поўная знявага элементарных правоў чалавека"[5].

Чалавек і супрацьпастаўленае яму грамадства – гэтая праблема ляжыць у цэнтры як рамана Германа Гесэ "Стэпавы воўк", так і аповесці Васіля Быкава "Аблава". Чалавек і грамадства – гэта Стэпавы воўк і свет буржуа, гэта Хвёдар Роўба і савецкая ўлада. У цэнтры мастацкага даследвання ў абодвух творах знаходзіцца душа чалавека, якая з'яўляецца люстэркам, сімвалам, сінтэзам навакольных з'яў, прычым душа раздвоенная, што сведчыць пра дваістасць самой эпохі.

Чым падобныя і чым адрозніваюцца два героі пісьменнікаў, яны адзінотнікі, ахвяры пэўных абставінаў абодвух яднае думка аб доме:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*"Ах, Гары, нам трэба прадрацца праз такую гразь, каб прыйсці дадому!* – кажа Герміна галоўнаму герою, як быццам чытаючы яго думкі і прадаўжае. – *І ў нас няма нікога, хто б павёў нас, адзіны наш праважаты гэта туга па дому*"[6]. Галоўным было дайсці да роднага кутка для Хведара Роўбы. Гэта шматперашкоднае, з абрыўкамі ўспамінаў аб мінулым вяртанне і апавядаецца ў аповесці "Аблава".

Абодва героі з'яўляюцца "ваўкамі". Хто ён такі, Стэпавы воўк з рамана Германа Гесэ? Адзінотнік, які блукае ў пустэчы. У гэтым творы, па словах Ю.Архіпава, "буржуазны ідэал жыццяўладкавання поўнасцю абнажыў сваю пустэчу..."[7]. Герой празаіка прабіраецца па вялікай, бязмежнай прасторы, спрабуючы знайсці тут прытулак, або... сябе. Нягледзечы на тое, што вакол нараджаюцца, працуюць, жывуць людзі, ён быццам глядзіць паверх гэтых галоў, успрымае іх як натоўп, з якога немагчыма вылучыць ні твара, ні постаці. Гэтыя людзі нібы маленькія пяшчынкі, аднолькавыя, падобныя адна да адной, якія засыпалі ўсю зямлю. І толькі сапраўдная Асоба можа паўстаць з гэтай масы; Яна здольная сама супрацьстаяць віхурам жыцця, якім без усялякай разважлівасці падпарадкоўваюцца гурбы пяску, уздымаючыся ў паветра, а потым паступова ўладкоўваючыся ў дзюнах. Яны поўнасцю аддаюцца свайму лёсу. І толькі галоўны герой адчувае ў сабе моц, здольнасць самому рэгуляваць сваё жыццё (на яго думку ён сам можа выбраць дзень сваёй смерці і здзейсніць задуманае). Гэта нялёгкае выпрабаванне – супрацьставіць сябе акаляючаму свету, – якое здаецца цяжэй ўдвая ад пачуцця адзіноты. Галоўны герой адчувае сябе адзінокім ваўком сярод стэпу. Адсюль і назва твора – "Стэпавы воўк". Сімвалічнай з'яўляецца і назва твора В.Быкава "Аблава". Воўк – дужы, моцны звер, якога не так проста перамагчы. Чалавек, як правіла, не ідзе адзін на адзін на паядынак з гэтай істотай. Ён бярэ на аблаву з сабою іншых людзей, выкарыстоўвае шэраг сродкаў (гукавыя сігналы, сабакі), каб акружыць яго, загнаць у тупік, а потым ужо забіць. Толькі так яго можна адужыць. Зрэшты, І.А.Чарота ў сваім артыкуле "Вобразы ваўка і ваўкалака ў славянскім фальклоры" піша, што, паводле сербскіх уяўленняў, чалавек "можа абараняцца ад ваўка, але забіць яго не мае права. Мо толькі вымушана: абараняючыся – тады, калі ўжо зграі пачынаюць збірацца ў населеных пунктах і ўяўляць сур'ёзную небяспеку"[8]. Загнаным ваўком адчувае сябе чалавек-ізгой, якога не прымае грамадства. Чаму? Ён парушыў агульныя законы, не хоча падпарадкоўвацца агульнапрынятаму ўкладу жыцця. Матыў гэты мае карані ў старажытнагерманскіх юрыдычных тэкстах, законах хетаў, а таксама ў Платона, дзе сэнсавая



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

формула "чалавек-воўк" засведчана ў адносінах да злачынцы. Злачынцамі, дакладней "ворагамі народа", лічыла для сябе савецкая краіна ўсіх тых, хто не хацеў прыстасавацца да яе ўкладу жыцця, ідэалогіі, хто нават не хацеў, дакладней, не захацеў думаць, меркаваць, дзейнічаць "па-савецку". Гэтыя людзі адчувалі сябе ваўкамі... Гэта яны з'яўляліся той перашкодай, якая нібыта псавала дзейнасць "агульнадзяржаўнага млына", які імкнуўсяператварыць усё і ўсіх у аднолькавую масу. Таму звычайных працаўнікоў трэба было зламаць, вылавіць, зацкаваць. Матыў аблавы на чалавека, асобу гучыць у творах рускай літаратуры: у вершы "Нобелеўская прэмія" Б.Пастэрнака, песні "Паляванне на ваўкоў" У.Высоцкага і г.д. Аб гэтым "Аблава" В.Быкава, дзе сама назва празорліва прадказвае трагізм паказаных падзей. Аблава на Роўбу раённага кіраўніцтва нагадвае аблаву на Леўчука фашыстамі з "Воўчай зграі". І ў "Аблаве" В.Быкава, і ў "Стэпавым ваўку" Г.Гесэ пад маскай жывёлы хаваюцца людзі. Абодва персанажы знешне або паводзінамі нагадваюць ваўкоў: " *Стэпавы воўк быў чалавекам гадоў пяцідзесяці... ён быў, сапраўды, як ён сябе падчас называў, Стэпавым ваўком, чужой, дзікай і адначасова робкай, нават вельмі робкай істотай з іншага свету...*"[9]. Або: "*Ён, Стэпавы воўк, запракінуў, прынюхваючыся, сваю вострую, караткавалосую галаву, павёў нярвовым носам, пацягнуў паветра вакол сябе*"[10]. Партрэтную характарыстыку Хвёдара Роўбы таксама можна параўнаць з апісаннем дзікага звера: "*Быў ён немаладога веку, даўгалыгі і шырокі ў плячах, але надта худы, з жылаватай вяцягнутай шыяй. На даўно не голеным твары чырванеў даўгі, прастуджаны нос, з-пад святлявых броваў насцярожана зыркалі шэрыя вочы. Рот яго быў трохі разяўлены – ад стомы ці залішняй увагі, і з-пад абвіслых вусоў вытыркаліся два ніжнія зубы, іншых спераду не было відаць. Дыханне ў чалавека чулася сіпатае і частае...*"[11]. У гэтым апісанні ў чымсьці выяўлыецца воўкава-натуралістычнае падабенства герояў твораў Г.Гесэ і В.Быкава.

Па-рознаму складваюцца іх адносіны з грамадствам. Гары Галер – адзінец, які сам агароджвае сябе, сваё ўнутранае жыццё ад дамаганняў знешнягу свету, наваколля. Хвёдар Роўба хоць і жадаў бы стаць бліжэй да людзей, стаць побач з імі, але яны вымушаюць яго стаць ізгоем.

Матыў жыцця і смерці гучыць у абодвух творах. Хвёдар Роўба, загнаны, як воўк у багну, заканчвае сваё жыццё самагубствам. "Не дадзена было ціха жыць, дык хоць пашчасціла ціха памеці," – заўважае В.Быкаў. Для Хвёдара смерць – самае лепшае выйсце з тых



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

абставінаў, у якія ён трапіў. Для Гары шалера смерць – выхад у вечнасць, бессмяротнасць.

Героі Г.Гесэ і В.Быкава, як мы пераконваемся, маюць маскі ваўкоў. Гэтае пераўтварэнне дае шмат матэрыялу для роздуму і параўнанняў. Узнікае шэраг пытанняў: чалавек хоча жыць або існаваць на гэтай зямлі? Ён гатоў пайсці на гібель за ідэю або ад ідэі? Па-рознаму інтэрпрэтуюць вобраз ваўка пісьменнікі. Гэта чалавек, падобны да ваўка, які супрацьпаставіў сябе грамадству, і чалавек, якога супрацьпаставіла сабе грамадства. І першы і другі адчуваюць сябе адзінокімі, бо не могуць патрапіць пад агульны трафарэт. Абодва адчуваюць сябе і чалавекам і ваўком адначасова. Першы "воўк" адбіўся ад сваёй зграі, стаў адзінотнікам, другі быў загрызены сваімі ж родзічамі, як загрызаюць ваўкі параненых і слабых жывёл. Гэтак у прыродзе. Толькі як быць адзінотнікам, жыць асобна сярод людзей? Абодва героі знаходзяцца ў безвыходным становішчы, якое прыносіць цяжкія пакуты. Драматызм іх перажыванняў, душэўных мук заключаецца ў адчуванні сваёй дваістасці. Выкарыстоўваючы вобраз ваўка, мастакі слова шляхам ідэйна-вобразных параўнанняў і сэнсава-змястоўных аналогій выявілі трагізм існавання чалавечай асобы ва ўмовах несвабоды, сацыяльна-ідэалагічнага ўціску.

---

[1] Гессе Г. Избранное. М.: Худ. лит., 1977. С. 243.

[2] Черота А.И. Образы волка и волколака в славянском фольклоре // Восточнославянский фольклор: поиски новых путей. Молодечно, 2000. С. 84.

[3] Лявонава Е.А. Плыні і постаці: З гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX-XX ст.: Дапаможнік для настаўнікаў. Мн.: Час."Крыніца", 1998. С. 169.

[4] Дубавец С.І. Практыкаванні: проза, эсэ, крытыка. Мн.: Маст.літ., 1992. С. 165.

[5] Тамсама. С. 166.

[6] Архипов. "Степной волк" или в поисках идеала // Литературная газета. 1989. 11 октября. С. 339.

[7] Тамсама. С. 15.

[8] См.: Черота А.И. Образы волка... С. 84.

[9] См.: Архипов. "Степной волк"... С. 207-208.

[10] Тамсама. С. 208.

[11] Быкаў В.У тумане. Мн.: Маст.літ., 1989. С. 314.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова